**НАЦЫЯНАЛЬНЫ КАМІТЭТ**
**АБ'ЯДНАНЫХ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ**

АБ'ЯДНАНЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ СІЛЫ БЕЛАРУСІ

1-2 кастрычніка 2005 года ў Мінску адбыўся Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі. Больш за 800 дэлегатаў, якія ўзялі ўдзел у форуме, прынялі шэраг дакументаў, у тым ліку рэзалюцыю, якая легітымізавала дзейнасць Нацыянальнага Камітэта. Галоўная задача дадзенай кааліцыйнай структуры - выпрацоўка альтэрнатыўнага бачання будучыні Беларусі.

Асноўныя накірункі дзейнасці Нацыянальнага камітэта АДС:

- **распрацоўка законапраектаў і альтэрнатыўных праграм развіцця краіны**;

- **падрыхтоўка адрасных пасланняў сацыяльным групам насельніцтва і садзейнічанне ў іх прасоўванні да грамадзян Беларусі**;

- **арганізацыя абмеркавання найбольш важных пытанняў унутранай і знешняй палітыкі**;

-**падрыхтоўка кіраўнічых кадраў і прад'яўленне грамадству кандыдатур сучасных кіраўнікоў**;

- **садзейнічанне ў інтэлектуальным забеспячэнні палітычных кампаній**;

-**падрыхтоўка прапаноў для рэалізацыі стратэгіі дыялогу з прадстаўнікамі і структурамі ўлады**;

-**экспертыза рашэнняў, прынятых на дзяржаўным узроўні**;

- **арганізацыя камунікацый і ўзаемадзеяння з экспертнай супольнасцю**;

Мінулая выбарчая кампанія ў Палату Прадстаўнікоў пацвердзіла, што выбаршчыкаў цікавіць не толькі персанальная альтэрнатыва беларускаму кіраўніку, але і ясны адказ на, падавалася б, простыя, але вельмі актуальныя для людзей пытанні. Якой пры новай уладзе будзе сістэма адукацыі і аховы здароўя? Па якіх дарогах людзі будуць ездзіць? Наколькі даступным будзе жыллё? Ці знойдуць яны абарону і справядлівасць у судзе?

*"Мы жадаем стварыць у галовах людзей канфлікт двух выяў - Беларусі, якая асацыюецца з Лукашэнкам, і Новай Беларусі, якую прапануем грамадству мы.*

*Чалавек павінен мець ясныя ўяўленні аб краіне і перспектыве, якія мы яму прапаноўваем, ён павінен бачыць і разумець, дзе яго месца ў Новай Беларусі",-* так вызначае галоўную задачу Нацыянальнага Камітэта яго старшыня **Анатоль Лябедзька**.

Сёння ў актыве Нацыянальнага Камітэта распрацоўка тэксту Малой Канстытуцыі, падрыхтоўка праекта Антыкрызіснай Платформы, прапаноў па змене Выбарчага Кодэкса, шматлікіх праектаў законаў.

На аснове праграмы "Стань гаспадаром у сваёй краіне" экспертамі Нацкама была падрыхтавана перадвыбарчая платформа адзінага кандыдата ў прэзідэнты **Аляксандра Мілінкевіча**. Адмыслова створаныя працоўныя групы распрацавалі пасланні ў выглядзе брашур, падрыхтаваныя для прадпрымальнікаў, настаўнікаў, працаўнікоў судовай сістэмы. Досвед сведчыць, што падобная практыка эфектыўная і перспектыўная.

У склад Нацыянальнага Камітэта ўваходзяць: адзін з самых вядомых эканамістаў краіны **Яраслаў Раманчук**, экс-кіраўнік Нацыянальнага банка, прафесар **Станіслаў Багданкевіч**, кіраўнік Рады беларускай інтэлігенцыі **Уладзімір Колас**, адзін з лідэраў беларускіх прафсаюзаў **Генадзь Федыніч**, палітыкі **Юрый Хадыка**, **Уладзімір Навасяд** і **Алена Скрыган**, якія маюць досвед парламенцкай працы, былы намеснік старшыні Канстытуцыйнага суда **Валерый Фадзееў**, вязень сумлення, былы член урада **Міхаіл Марыніч**.

.